# СКАНВОРД




**ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ**

**Па гарызанталі:** Аэрадром. Бык. Арда. Руно. Туш. Талер. Лона. Ага. Брута. Рып. Рана. Аўран. Амар. Мімоза. Рай. Верш. Асалода. **По вертыкалі:** Лібералі. Аркан. Рэйд. Мурашка. Рота. Адлер. Трата. Напалм. Ганна. Бяроза. Урна. Размова. Рыкша. Орша. Айва.

Склаў **Юрый ФАЛІНСКІ**, *г. Мінск.*

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.52 | 21.21 | 16.29 |
| Віцебск — | 4.35 | 21.18 | 16.43 |
| Магілёў — | 4.42 | 21.12 | 16.30 |
| Гомель — | 4.47 | 21.00 | 16.13 |
| Гродна — | 5.09 | 21.35 | 16.26 |
| Брэст — | 5.18 | 21.28 | 16.10 |

## Месяц

*Першая квадра 22 мая. Месяц у сузор'і Шаляў.*

## Імяніны

***Пр.*** *Германа, Дзяніса, Пятра.*
***К.*** *Віялеты, Магды, Барыса, Лявона, Рыгора, Урбана.*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

## 25 МАЯ

**У краіне**

**1933** год — нарадзіўся (в. Хвоева, цяпер у Нясвіжскім раёне) Рамуальд Іосіфавіч Клім, беларускі спартсмен (лёгкая атлетыка, кіданне молата), заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі. Чэмпіён (1964) і сярэбраны прызёр (1968) Алімпійскіх гульняў. Неаднаразовы прызёр чэмпіянатаў Еўропы, уладальнік Кубкаў Еўропы. Памёр у 2011 годзе.

**1933** год — у Мінску на базе Беларускай студыі оперы і балета заснаваны Беларускі дзяржаўны тэатр оперы і балета (цяпер — Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Рэспублікі Беларусь).

**1938** год — нарадзіўся (в. Закружка Мінскага раёна) Уладзімір Іванавіч Карызна, беларускі паэт, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. Працаваў на Беларускім радыё, у часопісах «Полымя», «Крыніца», выдавецтве «Юнацтва». Аўтар паэтычных зборнікаў «Край мой сінявокі», «Жураўліны досвітак», «Шумяць вербы...» і іншых, кніг для дзяцей. Больш як 200 яго вершаў пакладзены на музыку беларускімі кампазітарамі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Аўтар тэксту Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь.

**1944** год — французскі знішчальны полк «Нармандыя» пад камандаваннем маёра П. Пуяда накіраваны на 3-і Беларускі фронт. Удзельнічаў у Беларускай наступальнай аперацыі 1944 года, у тым ліку ў разгроме авіяцыі і войскаў праціўніка на аэрадромах Балбасава (Аршанскі раён), Дакудава (Крупскі раён), у Талачыне і Барысаве. За паспяховыя дзеянні пры фарсіраванні Нёмана палку прысвоена ганаровае найменне «Нёманскі». За 1943—1945 гады 148 лётчыкаў авіяпалка «Нармандыя-Нёман» здзейснілі больш як 5 тысяч баявых вылетаў, правялі 869 паветраных баёў, збілі каля 280 варожых самалётаў і 80 пашкодзілі.

**У свеце**

*Дзень Афрыкі. Адзначаецца па ініцыятыве ААН у гадавіну стварэння Арганізацыі афрыканскага адзінства (1963; з 2002 года — Афрыканскі саюз).*

**1918** год — нарадзіўся Канстанцін Навумавіч Воінаў (1918—1995), расійскі савецкі кінарэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР, народны артыст СССР. Паставіў фільмы «Сёстры», «Молада-зелена», «Жаніцьба Бальзамінава», «Рудзін» і іншыя.



**1941** год — нарадзіўся Алег Іванавіч Даль (1941—1981), рускі савецкі акцёр тэатра і кіно. Здымаўся ў фільмах «Жэня, Жэнечка і «кацюша», «Старая, старая казка», «Кароль Лір», «Зямля Саннікава» і іншых.

**1946** год — у Вашынгтоне было падпісана міжнароднае пагадненне, у адпаведнасці з якім былыя нейтральныя краіны абавязаліся вярнуць законным уладальнікам золата, атрыманае ў фашысцкай Германіі.

## УСМІХНЕМСЯ

**— Люся, ну як табе дачазаць, што мы з Таняй проста сябры і паміж намі нічога няма?..**

**— Прынясі мне яе галаву.**

Яна і ён.
— Што робіш?
— Чытаю Булгакава.
— Гэта той, які напісаў пра Валдэморта?
— Добра, што ты прыгожая.

**— Скажыце, доктар, якія лекі з'яўляюцца адначасова антысептыкам, болесуцішальным і супрацьзапаленчым?**
**— Гарэлачка, галубок, толькі гарэлачка!**
**— Я так і думаў, дзякуй, родненькі!**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1897.
Нумар падпісаны ў 19.30 24 мая 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12